Расейская Сацыялістычная Федэратыўная Радавая Рэспубліка.

*„Працоўны народ усіх краіоў, злучайся!“*

342(470)(008)
К 65

# КАНСТЫТУЦЫЯ

(АСНОЎНЫ ЗАКОН).

## Расейскае Сацыялістычнае Федэратыўнае Радавае Рэспублікі.

МОСКВА.
3-я Государственная тип., Мамоновский пер., 12.
1918 г.

20366

ІНВ. ПРАВЕРКА 1948 г.
Інв. 1954 г.

# КАНСТЫТУЦЫЯ

## (Асноуны закон)

## асейскае Сацыялістычная Федэратыунае Радавае Распублікі.

*Пастанова 5-го Усерасейскаго З'езду Радау рынятая у засяданьні 10 ліпца 1918 году.*

Зацьверджаная 3-м Усерасейскім З'ездам Ра-
ау у студні 1918 году дакляpацыя праў пра-
оунаго і абіранаго народу, разам з зацьвярд-
каямай 5-м з'ездам канстытуцыяй Радавае Ра-
публікі, складаюць едыны асноуны закон Ра-
ейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае
аспублікі.

Гэты асноуны закон вайходзіць у сілу з ма-
энту яго аглашэньня у скопчануй хвормя у
«Извѣстіях В. Ц. И. К.». Іон павінян быць
галошан усімі мейсцовымі установамі Радавае
ласьці і выстанауляны у ва усіх Радавых
установах на відочных мяйсцох.

5-й з'езд загадвая Народнаму Камісарыяту
Асьветы увясьці у ва усіх школах і вучэбных

завядзеньнях Расейскае Республікі завучываньня асноуных палажэньняу гэтае канстытуцыі, а так сама вытлумачываньне іх.

---

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ.

Даклярацыя прау працоунаго і абіранаго народу.

### Частка першая.

1. Расея аб'яуляяцца Распублікай Радау Працоуных, Салдацкіх і Селянскіх Дэпутатау. Уся уласьць у цэнтры і на мейсцах прыналежыць гэтым Радам.

2. Радавая Расейская Распубліка устанауляяцца на аснове вольнаго хаурусу вольных нацыяу, як федэрацыя (вольны злук) Радау нацыянальных распублік.

### Частка другая.

3. Становячы сваею мэтай зруйнаваньня усякаго абіраньня чалавека чалавекам, поунае забараненьня падзелу обчаства на станы, бязміласэрдная задауленьня абірайцау, установу сацыялістычнаго збудаваньня обчаства і пабеду сацыялізма у ва усіх краіох, III Усерасейскі з'езд Радау Працоунічых, Салдацкіх і Селянскіх Дэпутатау даляй пастанауляя:

а) Каб ужыць сацыялізацыю (агульная карыстаньня) зямлі, уласная маетнасць на зямлю касуяцца і увесь зямельны скарб абʻяуляяцца агульна - люцкім дабыткам і атдаецца працоунаму народу бяз усякаго выкупу, на заклад-зінах пароунаго зямлякарыстаньня.

б) Усе лясы, нутра зямлі, моры, вазеры і рэчкі агульна гасударсьцьвяннай вагі, а так сама і жывіолы ды начыньня, кшталтныя двары і селянска-гаспадарскія хвабрыкі, заводы, майстэрні і інш. обʻяуляюцца нацыянальным агульна-гасударскім дабыткам.

в) Як першы крок к поунаму пераходу хвабрык, заводау, руднікоу, чыгунак і іншых сродак вырабку і пяравозу у уласнасьць Радавае Працоуніча-Селянскае Распублікі,—падмацоуваяцца Радавы закон аб дагляд працоунікау і аб Высшуй Радзя Народнаго Гаспадарства ля мэты забязпячэньня уласьці працоунікау над абірайцамі.

2) Як першы удыр паміжнароднаму банкаваму, грашавому капіталу, III зʼезд Радау разглядая Радавы закон аб зністажэньні пазычак, зробляных царскім правіцяльствам, памешчыкау і буржуазеі, маючы пэунасьць, што Радавая уласьць пойдзя цьвіорда па гэтуй сьцежцы аж да поунае перамогі паміжнароднаго паустаньня працоунікау супраціу уціску капіталу (грашаунічаства).

д) Зацьвярджаяцца пяраход усіх банкау у уласнасьць працоуна-селянскаго гасударства, як

адна з умоу аслабаненьня працоунаго народу з пад уціску капіталу.

е) Дзеля таго, каб зніштожыць дармаедау і каб упарадкаваць гаспадарства, уводзіцца агульная працоуная павіннасьць.

ж) Каб забязпячыць усю поунасьць уласьці за працоунымі грамадамі і каб адагнаць усякую можнасьць вярнуца валадарству абірацяляу, узаканяяцца вааружэньня працоунаго народу, згуртаваньня чырваное арміі з працоунікау і селян і поуная адабраньня вааружэньня ад багатых станау.

### Частка трэйцяя.

4. Выказваючы няпахільную рашымасьць вырваць чалавецтва з кіпцяу грашавога капіталу і ваяунічаства, заліушых зямлю крывею у цяперашнюй, самуй злачыннуй ад усіх, вайне, III з'езд Радау цалкам далучаяцца да палітыкі, якую вядзе Радавая уласьць, разрываючы таемныя згаворы і робячы самая шырокая братаньня з працоунікамі і селянамі тых народау, якія цяпер ваююць з намі, каб дасягнуць, як бы там ня было, равалюцыйнымі мерамі дамакратычнай згоды паміж працоунікамі бяз атрэзау чужое зямлі і бяз усякаго штрафу грашыма, ці іншымі рэчамі, на аснове вольнаго самабудаваньня нацыяу.

5. З тэю ж мэтай III з'езд Радау намагая на тым, каб суйздром парваць грабежную палітыку буржуйнае цывілізацыі. Развіцце люцкое

адукацыі, якая будавала багатствы абіраццяў сярод нямногіх выбраных нацыяў, каб зрабіць парабкамі сотні мільёнаў працоўнікаў у Азіі, у калоньнях, кускі зямлі у рожных частках света, забраныя моцнымі гасударствамі і абірваныя імі і, наагул, у малых краіох.

6. III з'езд Радаў вітая палітыку Рады Народных Камісараў, агаласіўшай поўную незалежнасьць Фінляндзі, пачаўшае выводзіць войска з Пэрсіі, аб'явіўшае волю самаадзначэньня Арменіі.

### Частка чацьвертая.

7. III Усерасейскі з'езд Радаў Працоўнічых, Салдацкіх і Селянскіх Дапутагаў мяркуя, што цяпер, у хвілю адважнай змогі працоўнікаў з абірайцамі, абірайцам ня можа быць мейсца ні у воднум інстытуця уласьці. Уласьць павінна належаць цалкам толькі працоўным грамадам і іх паўнамоцнаму прадстаўніцтву—Радам Працоўнічых, Салдацкіх і Селянскіх Дапутатаў.

8. Разам з гэтым, прагучыся стварыць сапраўдна вольны, а з гэтым тым боляй поўны і моцны, хаўрус працоўных станаў усіх нацыяў Расеі, III з'езд Радаў абмежваяцца устаноўлю фундамэнтных пачаткаў федэрацыі (хаўрус) Радавых Распублік Расеі, якія даюць можнасьць працоўнікам і селянам кожнае нацыі прыняць якоя яны захочуць рашэньня на сваем уласнум, поўнамоцнум Радавум з'ездзя: ці жадаюць яны і на якой аснові быць су-

польнікамі у федэратыунум правіцяльсцьвя і у іншых федэральных Радавых установах.

---

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ.

## Агульныя палажэньня канстытуцыі Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі.

### Частка пьятая.

9. Асноуная мэта разлічанай на цяперашні пяраходны момэнт канстытуцыі Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі стасуяцца у тым, каб устанавіць дыхтатуру (усю паунату уласьці) працоунікау і бяднейшаго селянства, як наймацнейшую Усерасейскую Радавую уласьць, дзеля таго, каб суйздром задавіць буржуазею, зніштожыць абдзіранства чалавека чалавекам і ужыць сацыялізм, пры яком ня будзя ані падзелу на станы, ані гасударсцьвяннае уласьці.

10. Расейская Распубліка іосьць вольная сацыялістычная грамада усіх працуючых у Расеі. Уся уласьць у Расейскуй Сацыялістычнуй Федэратыунуй Радавуй Распубліцы прыналежыць усяму працоунаму народу, злучанаму у гарацкіх і селянскіх Радах.

11. Рады тых вобласьцяу, якія адметны асобным жыцьцем і нацыянальным складам,

могуць злучацца у аутаномныя (асобныя) вобласныя хаурусы; глаунымі іх кіраунікамі, як і глаунымі кіраунікамі усіх вобласных злукау, павінны быць Вобласныя з'езды Радау і іх спауніцяльныя установы.

Гэтыя аутаномныя вобласныя хаурусы уходзяць на пачатках федэрацыі у Расейскую Сацыялістычную Федэратыуную Радавую Республіку.

12. Вярхоуная уласьць у Расейскуй Сацыялістычнуй Федэратыунуй Радавуй Распубліцы прыналежыць Усерасейскаму з'езду Радау, а у перарыукі паміж з'ездамі—Усерасейскаму Цэнтральнаму Спауніцяльнаму Камітэту.

13. Дзеля забяспячэньня за працоуным народам сапрауднае свабоды сумленьня, цэркау адлучаяцца ад гасударства і вучылішча ад цэркві, а свабода веры і падвучываньня (прапаганда) супроціу усякае веры пазваляяцца усім грамадзянам.

14. Дзеля зябяспячэньня за працоуным народам сапрауднае свабоды выказваць свае думкі, Расейская Сацыялістычная Федэратыуная Радавая Распубліка зніштажая залежнасьць друку ад капіталу і аддае у рукі стану працоунікау і селянскае бяднаты усе тэхнічныя (усе машыны і прылады) і матэр'яльныя рэчы дзя выданьня газэтау, кніжак і усякіх іншых творау і забяспячая іх вольная распаусюджаваньня.

15. Дзеля забяспячэньня за працоуным народам сапрауднае свабоды сходак, Р. С. Ф. Р. Р., прызнаючы правы грамадзян Радавае Распу-

блікі вольна збірацца, рабіць мітынгі (сходкі, зборні), працэсыі і т. п., аддае у распаражэньня працоунічаго стану і селянскае бядноты усе прыгодныя дзеля народных сходак будынкі з мэбляю, святлом і апалам.

16. Дзеля забяспячэньня за працоуным народам сапраўднае свабоды хаурусау, Р. С. Ф. Р. Р., зламаушы эканамічная і палітычная валадарства багатых станау і адкінуушы гэтым усе прашкоды, якія дагэтуль перашкаджалі у буржуазнум абчасцьве працоунаму народу карыстаць свабодаю гуртаваньня і руху,—уселякімі спасобамі памагая працоунікам і бяднейшаму селянству злучацца і гуртавацца.

17. Дзеля забяспячэньня за працоуным народам сапраўднаго доступу да сьвядомасьці і развіцьця, Р. С. Ф. Р. Р. ставіць сваім загадам даць можнасьць працоунікам і бяднейшым селянам поунаго дарэмнаго адукаваньня.

18. Р. С. Ф. Р. Р. прызнае працу павіннасцьцю усіх грамадзян Распублікі і правазглашая ліозунг: „Ня працуючы, нехай ня есьць!“

19. Дзеля усямернае абароны дабыткау вялікае працоуна-селянскае равалюцыі, Р. С. Ф. Р. Р. прызнае, што усе грамадзяня Распублікі павінны бараніць сацыялістычную бацькаушчыну і устанауляя агульную ваенную павіннасьць. Пачэсная права бараніць равалюцыю з варужжам у руках даецца толькі працуючым; а на гультаіоу ускладаюцца іншыя ваенныя павіннасьці.

20. Зьвяртаючы увагу на салідарнасьць (папяркоуная, ожытная сябраваньня) працоунаго народу усіх нацыяу, Расейская Сацыялістычная Федаратыуная Радавая Распубліка дае усе правы чужаком, якія, жывуць на зямлі Расейскае Распублікі і працуюць у іой, належучы да працоунаго стану, альбо да селянства, ня карыстаючаго з чужое працы, і прызнае за мяйсцовымі Радамі правы даваць такім чужаком, бяз усялякіх прапікаджаючых хвармальнасьцяу, правы расейскаго грамадзянства.

21. Р. С. Ф. Р. Р. дае правы уховы усім чужаком, якія маюць уціск у сваіом краю за палітычныя і рэлігійныя злачынствы.

22. Р. С. Ф. Р. Р. прызнаючы роуныя правы за грамадзянамі незалежна ад іх расавае *) і нацыянальнае прыналежнасьці, аб'яуляя, што установа, ці дапушчэньні, якіх-небудзь прывілеяу, альбо пярасіленьня, ці які б то ня быу уціск меньшых па ліку нацыянальнасьцяу большымі, будзя іці упоперак асноуным законам Распублікі.

23. Кіруючыся інтарэсамі працоунаго стану у цалку, Р. С. Ф. Р. Р. забараняя атдзельным асобам і асобным гуртом карыстаць правамі, якія б маглі шкодзіць сацыялістычнуй рэвалюцыі.

---

*) Асобны па крыві і коляру народ. Увесь народ у сьвеця падзяляяцца на некулькі такіх расау, як напр. белая, чорная, жоутая ды інш.

# РАЗДЗЕЛ ТРЭЦЬЦІ.

## Будова Радавае уласьці.

## *А. Арганізацыя Цэнтровае уласьці.*

### Частка шостая.

### Аб Усерасейскум З'ездзя Радау Працоунічых, Селянскіх, Казачых і Чырвонае арміі Дапутатау.

24. Усерасейскі З'езд Радау з'яуляяцца вышэйшаю уласьцю Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі.

25. Усерасейскі З'езд Радау складаяцца з прадстаунікау гарацкіх Радау, па рахунку 1 дапутат на 25.000 выбарчых і прадстаунікау губэрскіх з'ездау Радау па рахунку 1 дэпутат на 125.000 жыхароу.

*Прыметка I.* У прыпадку, калі Губэрскі З'езд Радау ня склікауся пярад Усерасейскім З'ездам, та прадстаунікі на Усерасейскі З'езд пасылаюцца проста ад Павятовых Радау.

*Прыметка II.* У прыпадку, калі Вобласны З'езд Радау склікауся пярад самым Усерасейскім З'ездам, та прадстаунікі на Усерасейскі З'езд магуць быть пасланы Вобласным З'ездам.

26. Усерасейскі З'езд Радау склікаяцца Усерасейскім Цэнтровым Спауніцяльным Камітэтам ня радчэй, як два разы у год.

27. Надзвычайны Усерасейскі З'езд склікаяцца Усерасейскім Цэнтровым Спауніцяльным Камітэтам па уласнаму зачыну альбо па трэбаваньню Радау мейснасьцяу, якія налічваюць агульна ня меняй як $^1/_3$ усяго насяленьня Распублікі.

28. Усерасейскі Цэнтровы Спауніцяльны Камітэт у ліку ня больш як 200 чалавек.

29. Усерасейскі Цэнтровы Спауніцяльны Камітэт у цалку адветны пярад Усерасейскім З'ездам Радау.

30. У час між, З'ездамі, вышэйшаю уласьцю Распублікі з'яуляяцца Усерасейскі Цэнтровы Спауніцяльны Камітэт.

## Частка сіомая.

## Аб Усерасейскум Цэнтровум Спауніцяльнум Камітэця.

31. Усерасейскі Цэнтровы Спауніцяльны Камітэт іосьць вышэйшая установа Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі; іон выдае законы, загадвая і сачыць над усімі справамі Распублікі.

32. У. Ц. С. К. дае агульны напрамак усім дзеям Працоуна-Селянскаго Правіцяльства і усіх установау Радавае уласьці у краю, злучая і ладуя працу па выданьню законау і па кірунку і сачыць за правядзеням у жыцьціо Радавае канстытуцыі, пастановау Усерасейскіх Радавых З'ездау і цэнтровых установау Радавае уласьці.

33. У. Ц. С. К. разглядая і зацьвярджая

праэкты дакрэтау і іншыя гаданьня, якія уносіць Рада Народных Камісарау, альбо асобныя ведамствы, а так сама выдае уласныя дакрэты і загады.

34. У. Ц. С. К. склікая Усерасейскі З'езд Радау, якому дае адчот аб сваіх дзеях і даклады па агульнуй палітыцы і па асобным пытаньням.

35. У. Ц. С. К. закладая Раду Народных Камісарау дзеля агульнаго кірунку справамі Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі і атдзелы (народныя камісарыяты) дзеля кірунку асобнымі справамі.

36. Члены У. Ц. С. К. працуюць у атдзелах (народных камісарыятах), альбо выпауняюць асобныя загады Усерасейскаго Цэнтроваго Спауніцяльнаго Камітэту.

## Частка восьмая.

### *Аб Радзя Народных Камісарау.*

37. Радзя Народных Камісарау прыналежыць агульны кірунак справамі Расейскае Сацыялістычнае Федэратыунае Радавае Распублікі.

38. Дзеля ужываньня гэтай задачы Рада Народных Камісарау выдае дакрэты, загады, навучэньня і агульна прыймая усе меры, патрэбныя дзеля спраунаго і шпаркаго ціоку гасударсьцьвяннаго жыцьця.

39. Аб усіх сваіх пастановах і парашэнь-

нях Рада Народных Камісарау ня у забавя павядамляя У. Ц. С. К.

40. У. Ц. С. К. мая правы адмяніць альбо спыніць парашэньня Рады Нар. Кам.

41. Усе пастановы і парашэньня Рады Нар. Кам., якія маюць бойная агульна - палітычная значэньня, прыстауляюцца на разгляд і зацьвярджэньня Усерасейскаго Цэнтроваго Спауніцяльнаго Камітэту.

> *Прыметка.* Калі якія-небудзь справы патрабуюць няадвалочнаго выпауненьня, дык яны магуць быць ужыты самою Радаю Народных Камісарау.

42. Члены Рады Нар. Кам кіруюць асобнымі Народнымі Камісарыятамі.

43. Народных Камісарыятау складаюцца 17. Вось якія:

а) па іназемным справам;
б) па ваенным справам;
в) па марскім справам;
г) унутраных справ;
д) справядлівасьці;
е) працы;
ж) сацыяльнаго забясьпячэньня;
з) народнае асьветы;
ы) п штау і тэлеграфау;
і) па нацыянальным справам;
к) па грашавым справам;
л) пуцьціоу саабшчэньня;
м) па зямельным справам;
н) гандлю і прамысловасьці;

о) народнаго прыдавольсцьвя;
п) гасударсьцьвяннаго кантролю;
р) Вышэйшая Рада Народнае Гаспадаркі;
с) аховы здароуя.

44. Пры кожнум Народнум Камісару, пад яго кіраунiцтвам закладаяцца калегія; члены яе зацвярджаюцца Радаю Народных Камісарау.

45) Народны Камісар мая правы сам сабою парашаць усе пытаньня, якія належаць да кірунку яго камісарыяту, павядамляючы аб гэтум калегію. У тым прыпадку, калі калегія будзя нязгодна з тым ці іншым парашэньням Народнаго Камісара, калегія, ня спыняючы выпауненьня парашэньня, можа абскардзіць яго у Радзе Народных Камісарау, альбо у Прэзыдыумя У. Ц. С. К.

Такоя ж самая права на скаргу прыналежыць і асобным членам калегіі.

46. Рада Народных Камісарау у цалку адвячая *пярад Усерасейскім З'ездам Радау* і *У.* Ц. С. К.

47. Народныя Камісары і калегіі пры Народных Камісарыятах у цалку адвячаюць пярад Радаю Народных Камісарау і пярад У. Ц. С. К.

48. Прозвішча Народных Камісарау прыналежыць толькі членам *Рады Народных Камісарау,* якая кіруя справамі Р. С. Ф. Р. Р., і ніякім іншым прадстаунікам Радавае уласьці як у цэнтру, так і на мейсцах гэтая права ня можа быць прысвояна.

## Частка дзяуятая.

*Якія справы належаць да кірунку Усерасейскаго З'езду Радау і Усерасейскаго Цэнтроваго Спауніцяльнаго Камітэту.*

49. Да кірунку Усерасейскаго Цэнтроваго Спауніцяльнаго Камітэту падналежаць усе пытаньня агульна—гасударсьцьвяннае вагі, вось якія:

а) Зацьвярджэньня, пяраіначваньня і дадаткі, да канстытуцыі Р. С. Ф. Р. Р.

б) Агульны кірунак усею іназемнаю і унутранаю палітыкаю Р. С. Ф. Р. Р.

в) Устанавеньня і пяраіначваньня граніц, а так сама адчужэньня частак зямлі Р. С. Ф. Р. Р. альбо належачых да яе правоу.

г) Устанавеньня межау і свядамосьці вобласных Радавых хаурусау, якія уходзяць у злук з Р. С. Ф Р. Р., а так сама парашэньня спрэчак паміж імі.

д) Далучэньня у хаурус Р. С. Ф. Р. Р. новых вобласьцяу, ці частак і прызнаньня выхаду з Расейскае Федэрацыі асобных частак яе.

е) Агульна - адміністратыуны падзел зямлі Р. С. Ф. Р. Р. і зацьвяржэньня вобласных злукау.

ж) Устанавеньня і пяраіначваньня мерак вагі і грошай на зямлі Р. С. Ф. Р. Р.

з) Зносіны з іназемнымі гасударствамі, аб'яуленьня вайны і замірэньня.

і) Пазычка грошай, згавор аб мытах і гандлю, а так сама грашавыя справы.

к) Устанавеньня асновау і агульнаго пляну усяе народнае гаспадаркі і асобных яе частак на зямлі Р. С. Ф. Р. Р.

л) Зацьвярджэньня бюджэту (прыходу і расходу) Р. С. Ф. Р. Р.

м) Устанавеньня агульна-гасударсьцьвянных падаткау і павіннасьцяу.

н) Устанавеньня асновау гуртаваньня вааружанных сіл Р. С. Ф. Р. Р.

о) Агульна-гасударсьцьвянная выданьня законау, нарыхтаваньня судоу і судзебных спрау, грамадзянская і крымінальная заканадауства і інш.

п) Назначэньня і выдаленьня, як асобных членау Рады Народных Камісарау, так і усяе Рады Нар. Кам. у цалку, а так сама зацьвярджэньня Старшога (Прадсядацяля) Рады Народных Камісарау.

р) Выданьня агульных пастаноу аб здабытку і страця правоу расейскаго грамадзянства і аб правох чужакоу у Расейскуй Распубліцы.

с) Права амністыі (памілаваньня) агулам і часткаю.

50. Апрыч пераліčаных пытаньняу, да кірунку Усерасейскаго З'езду Радау і Усерасейскаго Ц. С. К. прыналежаць усе пытаньня, якія яны прызнаюць падналежнымі іх парашэньню.

51. Ніжай паказанымі справамі кіруя тольікі адзін Усерасейскі З'езд Радау:

а) Устанавеньня, дадатак і пяраіначваньня асноуных закладзін Радавае канстытуцыі;

б) ратыфікацыя (зацьвярджэньня) згодных умовау.

52. Парашэньня пытаньняу, абгавораных у пункця в і з стацьці 49, пазваляяцца Усерасейскаму Ц. С. К. толькі тады, як нельга склікаць Усерасейскаго З'езду Радау.

*Б. Арганізацыя Радавае уласьці на мейсцах.*

## Частка дзісятая.

## Аб з'ездах радау.

53. З'езды Радау роблюцца такім кшталтам:

а) Вобласныя з прадстаунікау гарацкіх Радау і павятовых з'ездау, па рахунку 1 дапутат на 25.000 жыхароу, а ад гарадоу па 1 дапутату на 5.000 выбарчых, але ня боляй як 500 прадстаунікау на усю вобласьць, — альбо з прадстаунікау губэрскіх з'ездау Радау, якія выбіраюцца па тым самум рахунку, калі гэты з'езд зьбіраяцца пярад з'ездам вобласным.

б) Губэрнскія (вакружныя) — з прадстаунікау гарацкіх Радау і валасных з'ездау па рахунку 1 дапутат на 10.000 жыхароу, а ад гарадоу, па 1 дапутату на 2.000 выбарчых, але ня боляй як 300 дапутатау на усю губэрню (вакругу); а у тым прыпадку, калі павятовы

з'езд Радау склікан пярад губэрнскім з'ездам, дык выбары роблюцца па гэткаму-ж самаму рахунку ня валаснымі з'ездамі, а павятовым.

в) Павятовыя (районныя)—з прадстаунікау, вясковых Радау, па рахунку 1 дапутат на 1.000 жыхароу, але ня боляй як 300 дапутатау на увесь павет (район).

г) Валасныя—з прадстаунікау усіх вясковых Радау, па рахунку 1 дапутат на кожныя 10 членау Рады.

*Прыметка 1.* У павятовых з'ездах маюць судольніцтва прадстаунікі гарацкіх Радау, калі насяленьня гораду ня пярасягая 10.000 чалавек; вясковыя Рады тых віосак, у якіх жыве меняй як 1.000 чалавек, дзеля выбарау дапутатау на павятовы з'езд злучаюцца.

*Приметка 2.* Калі у вясковуй Радзя меняй як 10 членау, дык яна пасылая на валасны з'езд аднаго прадстауніка.

54. З'езды Радау склікаюцца належнымі спауніцяльнымі установамі Радавае уласьці (Спауніцяльнымі Камітэтамі) па іх угляду, альбо па патрабаваньню Радау местау, у якіх налічваяцца ня меняй як $^1/_3$ усяго насяленьня гэтаго района, але усіо-ж т'кі ня радчэй двух разоу на год па вобласьці, аднаго разу у тры месяцы па губэрні і паветах і аднаго разу у месяц па воласьці.

55. З'езд Радау (вобласны, губэрскі, павятовы, валасны) выбірая свой Спауніцяльны Камітэт,

[…]яком лік членау ня павінян перавышаць: […]) па вобласьці і губэрні—25, б) па павету—20, […]) па воласьці — 10. Спауніцяльны Камітэт […]уцэльна адвячая пярад З'ездам Радау, які яго […]выбрау.

56. У межах свайго кірунку З'езд Радау (вобласны, губэрскі, павятовы, валасны) іосць […]вышэйшая на сваіом пляцу уласьць; у тыя-ж […]часы, як німа з'ездау, гэткаю уласьцю іосьцяка […]Спауніцяльны Камітэт.

## Частка адзінанцатая.

## Аб Радах Дапутатау.

57. Рады Дапутатау гуртуюцца:

а) У гарадох — па рахунку 1 дапутат на […]кожную 1.000 жыхароу, але ня меняй як 50 […]і ня боляй як 1.000 членау.

б) У сяліцьбах (віосках, сіолах, станіцах, […]мястэчках, гарадох, у якіх меняй як 10.000 жыхароу, аулах, хутарох і інш.)—па рахунку 1 дапутат на кожныя 100 жыхароу, але ня меняй ак 3 і ня боляй як 50 дапутатау на кожную сяліцьбу.

Тэрмін паунамоцнасьці дапутатау—3 месяцы.

*Прыметка.* У тых вясковых мейсцах, гдзе гэта прызнаяцца можным ажыцявіць, пытаньня кірунку парашаюцца самым агульным сабранням выбарчых гэнае сяліцьбы.

58. Дзеля цякучае працы Рада Дапутатау выбірая паміж сябе Спауніцяльны Камітэт, у

ліку ня боляй як 5 чалавек у сяліцьбах, а у гарадох па рахунку 1 на кожныя 50 членау, але ня меняй як 3 і ня боляй як 15 (Пяцярбург і Масква ня боляй як 40). Спауніцяльны Камітэт цалком адвячая пярад Радаю, якая яго выбрала.

59. Рада Дапутатау склікаяцца Спауніцяльным Камітэтам па яго угляду, альбо па патрабаваньню ня меняй палавіны членау Рады, але ня радчэй як 1 раз у тыдзянь у гародах і 2 разы у тыдзянь у сяліцьбе.

60. У межах свайго кірунку Рада, а у прыпадку, паказанум у § 57 (прыметка), агульная сабраньня выбарчых, іосьць вышэйшая на сваім абшару уласьць.

## Частка двананцатая.

*Аб рэчах кірунку установау Радавае уласьці на мейсцах.*

61. Вобласныя, губэрскія, павятовыя і валасныя установы Радавае уласьці, а так сама Рады Дапутатау кіруюць такімі справамі:

а) правядзеньня у жыцьціо усіх пастанов суналежных вышэйшых інсцітуцыяу Радавае уласьці;

б) прыйманьня усіх спосабау, каб паднясьці гэнную мяйсцовасьць у культурнуй і гаспадарскуй справах;

в) парашэньня усіх пытаньняу, якія маюць чыста мяйсцовую значнасьць;

г) згуртаваньня усіх Радавых дзеяу у межах гэнаго абшару.

62. З'ездам Радау і іх Спауніцяльным Камітэтам прыналежыць права сачыць за дзеямі мяйсцовых Радау (бач вобласнымі — за радамі гэнае вобласьці, губэрскім — за усімі Радамі губэрні, акром гарацкіх, якія ня уходзяць у склад павятовых з'ездау і г. ін.), а вобласным і губэрскім з'ездам і іх Спауніцяльным Камытэтам—апрыч таго, прыналежыць права адменіпарашэньняу залежных ад іх па губэрні ці па вобласьці Радау, з павядамленьнем аб гэтум у важнейшых прыпадках Цэнтровае Радавае уласьці.

63. Дзеля выпауненьня узложаных на установы Радавае уласьці заданяу пры Радах (гарацкіх і вясковых) і Спауніцяльных Камітэтах (вобласных, губэрскіх, павятовых і валасных) гуртуюцца суналежныя атдзелы, з старшымі над імі (заведуючымі).

---

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦЬВЕРТЫ.

### *Права выбіраць і быць выбраным.*

#### Частка трынанцатая.

64. Правамі выбіраць і быць выбранымі у Рады карыстаюць, нязалежна ад веры, нацыянальнасьці, аседласьці і т. сп. ніжэй пералічаныя мужчыны і кабеты—грамадзяня Расейскае

Сацыялістычнае Фэдэратыунае Радавае Рэспублікі, якім да дня выбарау споунілася васімнацаць гадоу:

а) Усе, якія дастаюць сродкі да жыцьця патрэбнаю і грамадзянска-карыснаю працаю, а так сама асобы працуючыя у дамашнюю гаспадарсьцьвя, бач: працоунікі і найміты усялякіх аблікау і катэгорыяу, якія працуюць у промысля, гандлю, сельскуй гаспадарцы і інш., селяня і казакі-зямляробы, якія ня карыстаюць з працы наймітау;

б) салдаты Радавае арміі і флоту;

в) грамадзяня, якія успамінаюцца у пунктах а і б стацьці 64, страціушыя якую-небудзь частку здольнасьці да працы.

Прыметка 1. Мейсцовыя Рады магуць, з зацьвярджэньня Цэнтровае уласьці, памяньшаць установляную гэнай стацьціой даросласьць (гады).

Прыметка 2. З асоб, ня уступіушых у лік расейскіх грамадзян, маюць правы выбіраць і быць выбранымі так сама асобы, якія паказаны у ст. 20 (Раздзел другі, частка пьятая).

65. Ня выбіраюць і ня могуць быць выбранымі, хоць-бы яны і увайходзілі у адну з вышэй пералічаных катэгорьяу:

а) асобы, якія трымаюць наймітау, каб мець карысьць і прыбытак ад іх працы;

б) асобы, якія жывуць з нязапрацованаго

прыбытку, бач: з процанту ад капіталу, даходы з гандляу, з меньня і т п.;

в) уселякія гандляры і гандлёуныя макляры;

г) манахі і усялякія духаунікі;

д) найміты і агенты даунейшае паліцыі, асобнаго корпуса жандарау і ахранных атдзяленяу, а так сама члены даунейшаго царскаго роду;

е) асобы, якія прызнаны няпрытомнымі, альбо сумасошлымі, а так сама тыя, што знайходзяцца пад апекаю;

ж) асобы, якія асуждаiы за карысныя і ганебныя злачынствы, на тэрмін, устануляны законам ці прысудам.

## Частка чатырнанцатая.

### *Аб тым, як рабіць выбары.*

66. Выбары роблюцца па устаноунаму звычаю у тыя дні, у якія загадаюць мейсцовыя Рады.

67 Выбары роблюцца пры выбарчуй камісьсі і пры прадстауніку мяйсцовае Рады.

68. У тых прыпадках, калі прадстауніку Радавае уласьці нельга быць пры выбарах, яго замяняя старшы (прадсядацяль) выбарчае камісьсі, а як німа і яго,—старшы выбарчаго сабраньня.

69. Аб тым, як ідуць выбары і хто выбран, запісваяцца у акт, на яком павінны падпісацца члены выбарчае камісі і прадстаунік Рады.

70. Усе дробнасці парадку, як рабіць выбары

і як да іх маюць быць прылучаны прафэсіанальныя і іншыя працоуныя харусы, прызначаяцца мяйсцовымі Радамі, згодна з апісаным загадам У. Ц. С. К.

## Частка пятнанцатая.

*Аб праверцы і адменя выбарау і аб атзыву дапутатау.*

71. Увесь матарьял па справам выбарау ідзе у суналежную Раду.

72 Рада дзеля паверкі выбарау назначая паверачную камісьсю.

73 Аб тым, што камісься знайдзя пры паверцы выбарау, яна дакладая Радзя.

74. Рада парашая пытаньня аб зацьвярджэньні спрэчных кандыдатау.

75. У прыпадку нязацьвярженьня якоганебудзь кандыдата, Рада назначая новыя выбары.

76. У тым прыпадку, калі выбары зробляны уцалку няпраудзіва, пытаньня аб адменя выбарау парашаяцца вышейшаю па парадку установаю Радавае уласьці.

77. Самаю вышейшаю і апошняю установаю па абскаржэньню выбарау з'яуляяцца У. Ц. С. К.

78. Выбарчыя, паслаушыя у Рады дапутата, маюць права заусягды адазваць яго і зрабіць новыя выбары, згодна з агульнаю установаю.

---

## Раздзел пьяты.

*Права расходу ды прыходу казны (Бюджетная права.)*

### Частка шаснанцатая.

79. Грашавая палітыка Расейскае Сацыялістычнае Федератыунае Радавае Распублікі у цяперашні пяраходны мамент дыхтатуры працоунаго народу успамагая асноуну́й мецi абнішчення буржуазеі і прыгатаулевьня варункау дзеля усеагульнае роунасьці грамадзян Распублікі у справах вырабау і распамяруваньня багацтва. З гетай метай Распубліка ставіць сабе загадам даць установам Радавае уласьці усе патребныя сродкі дзеля задавальненьня мейсцовых і агульна-гасударсьцьвянных патреб Радавае Распублікі ня спыняючыся перад утарженьням у правы частнае уласьнасьці.

80. Гасударсьцвянныя даходы і расходы Расейскае Сацыялістычнае Федератыуное Радавае Распублікі злучаюцца у агульна—гасударсьцьвяннум бюджеця.

81. Усерасейскі З'езд Радау альбо Усерасейскі Центровы Спауніцяльны Камітет прызначаюць, якія аблікі даходау і зборау уходзяць у агульнагасударсьцьвянны бюджет і якія ідуць на патребы мейсцовых Радау, а так сама устанауляюць вялічыню абложеньня.

82. Рады устанауляюць аблажэньня падаткамі і зборамі толькі на патрэбы мяйсцавае гаспадаркі. Патрэбы агульнагасударсьцьвянныя задавальняюцца з гасударсьцьвяннаго казначэйства.

83. Ніякая страта з гасударсцьвяннае казны ня можа быць зробляна бяз прыстауленьня на яе па росьпісі гасударсцьвянных даходау і расходау альбо выданьням асобнае пастановы Цэнтровае уласьці.

84. На задавальненьня патрэб, якія маюць агульнагасударсцьвянная значэньня, мяйсцовым Радам адпушчаюцца належачымі Народнымі Камісарыятамі патрэбныя крэдыты з гасударсцьвяннаго казначэйства.

85. Усе крэдыты, якія адпушчаюцца Радам гасударсцьвяннаго казначэйства, а так сама крэдыты, якія зацьверджаны на мяйсцовыя патрэбы, павінны расходавацца Радамі у межах сметных падраздзелау (па параграхвам і стацьцям), бач толькі на тыя рэчы, на якія яны прызначаны, а на якія небудзь іншыя патрэбы трацiцца ня павінны бяз асобнаго на тоя пастанауленьня У. Ц. С. К. і Рады Нар. Кам.

86. Мяйсцовыя Рады сачыняюць паугадавыя і гадавыя сметы (рахункі) даходау і расходау на мяйсцовыя патрэбы. Сметы вясковых і валасных Радау і Радау гарадоу, якія маюць судольніцтва у павятовых з'ездах, а так сама сметы павятовых установау Радавае уласьці. зацьвярджаюцца суналежна губэрскімі і вoблас-

ными з'ездамі, альбо іх Спауніцяльнымі Камітэтамі. Сметы гарацкіх, губэрскіх і вобласных установау Радавае уласьці зацьвярджаюцца Усерасейскім Цэнтровым Спауніцяльным Камітэтам і Радаю Народных Комісарау.

87. Калі якія-небудзь расходы ня угаданы сметамі, альбо калі будзя бракаваць па сметнаму рахунку дзеля задавальненьня мяйсцовых патрэб, дык трэба прасіць у належачых Народных Камісарау дадатковых крэдытау.

88. У прыпадку браку мяйсцовых срод[к]
дзеля задавальненьня мяйсцовых патрэб, мяйсцовым Радам пазваляяцца браць патрэбны падмогі ці пазычкі з гасударсцьваннаго казначэйства; пазваленьня на гэта павінны даць Усерасейскі Цэнтровы Спауніцяльны Камітэт і Рада Народных Камісарау.

---

## Раздзел шосты.

### *Аб гэрбя і сьцягу Расейскае Сацыялістэычнае Федэратыунае Радавае Распублікі.*

### Частка семнанцатая.

89. Гэрб Р. С. Ф. Р. Р. складаяцца з нарысу на чырвонуй кнеі у праменьні сонца сярпа і молата, зложаных крыж-на-крыж, ручкамі уніз, аколяных вянком з каласоу, і з надпісам:

а) Расейская Сацыялістычная Федэратыуная Радавая Распубліка.

і б) Працоўны народ усіх краіоў, злучайся!

90. Гандлёвы, марскі і ваенны сьцяг Р. С. Ф. Р. Р. складаяцца з палатнішча чырвонага коляру; у лівум кутку яго, каля дрэўка, наьерся, напісана залатымі літарамі „Р. С. Ф. Р. Р.“ альбо надпіс: „Расейская Сацыялістычная Федэратыўная Радавая Распубліка“.

Старшыня V Усерасейскаго З‘езду Радаў і У. Ц. С. К.— **Я. Свердлов.**

Члены Прэзыдыуму У. Ц. С. К.: **Т. И. Теодоровіч, Ф. А. Ропін, А. О. Розенгольц. А. Х. Мітрофанов, К. Г. Максімов.**

Пісар У. Ц. С. К. **В. А Аванесов.**